1. *Выготский Л.С.* Воображение и творчество в детском возрасте. – СПб.: Союз. 1997. – 96 с.

2. *Выготский Л.С.* Избранные психологические исследования. – М.: Изд-во АПН РСФСР, 1956 .– 519 с.

3. *Выготский Л.С.* Проблемы дефектологии / Сост. Т.М. Лифанова. – М.: Просвещение, 1995. – 527 с.

4. *Выготский Л.С.* Психология искусства. – М.: Педагогика. 1987. – 344 с.

5. *Леонтьев А.Н.* Деятельность. Сознание. Личность. – М.: Политиздат, 1977. – 304 с.

6. *Мойсейчук С.Б.* Художественно-творческая деятельность детей-инвалидов (вопросы социально-психологической реабилитации). – Мн.: Веды, 2001. – 110 с.

7. *Пиаже Ж.* Избранные психологические труды. – М.: Просвещение, 1969. – 659 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**В.М.Наумчык,** *прафесар*

## ПЕДАГОГІКА І САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Станаўленне і развіццё сацыякультурнай дзейнасці (СКД) у краіне ставяць пытанне аб яе педагагічным патэнцыяле. Адказ на яго дазволіць выявіць межы сацыякультурных даследаванняў, ступень пранікнення СКД у выхаваўча-навучальны працэс сучаснай школы. З гэтай мэтай адзначым істотныя рысы педагагічнага працэсу ў школе. Будзем арыентавацца не на імператыўна-камандны стыль кіравання выхаваннем моладзі, а на той стыль, які дазваляе расквітнець таленту, дазваляе атрымаць сапраўдныя веды ў галіне як прыродазнаўчых дысцыплін, так і грамадскіх. Такі падыход не з‘яўляецца новым, у гісторыі педагогікі ўжо былі перыяды, калі асобе надавалася значная ўвага, выхаванне вялося

з ўлікам прыроды чалавека і культуры канкрэтнага сацыяльнага асяроддзя. Больш за ўсё адметныя рысы такога выхавання знайшлі адлюстраванне ў сістэме свабоднага выхавання, тэорыю і практыку якога распрацоўвалі такія вядомыя вучоныя, як Я.А.Каменскі, Ф.А.Дыстэрвег, Л.М.Талстой, М.Мантэсоры, Р.Штэйнер, К.М.Вентцэль і інш. Звернемся да вопыту гэтых даследчыкаў феномена чалавека і паспрабуем прасачыць, як сацыякультурная дзейнасць уплывае на фарміраванне светапогляду асобы. Адзначым, што светапогляд нельга навязаць звыш, ён фарміруецца ва ўмовах свабоднага развіцця асобы, якая ўспрымае навакольны свет – прыроду і сацыяльныя адносіны паміж людзьмі – як адзінае цэлае.

Каб разгледзець феномен трансфармацыі чалавека ад індывіда да асобы, звернемся да малюнка. Асоба – гэта чалавек, які мае свой асабісты светапогляд, ён здольны рабіць выбар і адказваць за вынікі такога выбару. Няцяжка заўважыць, што асобай чалавек становіцца ў працэсе сацыялізацыі.




*Структура фарміравання светапогляду асобы*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыялізацыя (ад лац. socialis – грамадскі) – адаптыўны працэс, у выніку якога чалавек прымае законы таго ці іншага соцыуму і, як правіла, следуе ім. У працэсе сацыялізацыі індывідуум засвойвае сацыяльны вопыт, які абумоўлены цэлым шэрагам сацыяльна-эканамічных, сацыяльна-псіхалагічных, педагагічных фактараў. Ён азначае ўключанасць асобы ў сістэму грамадскіх зносін і дзейнасць па ўзнаўленні гэтых зносін у мікрасоцыуме, уключанасць асобы ў сістэму ролей, правоў і абавязкаў грамадзяніна сваёй Айчыны.

Тэрмін «сацыялізацыя» мае шмат трактовак. Так, напрыклад, можна знайсці сцвярджэнне, што працэс сацыялізацыі – гэта засваенне сацыяльных нормаў, уменняў, стэрэатыпаў, сацыяльных установак, прынятых у грамадстве формаў паводзін і зносін, варыянтаў жыццёвага стылю. Тут важна падкрэсліць слова «прысваенне», таму што сацыялізацыя не толькі засваенне, але і прысваенне сацыяльнага вопыту. Чалавек здольны многае засвоіць: і формы паводзін, і пэўныя стэрэатыпы, прынятыя ў грамадстве, і варыянты жыццёвага стылю. Але не заўсёды можна сцвярджаць, што такі чалавек сацыялізаваны ў канкрэтным соцыуме.

Першасная сацыялізацыя чалавека адбываецца ў сям'і, у школе. Школа – гэта грамадскі інстытут, у якім дзеці вучацца і выхоўваюцца. Падзяліць навучанне і выхаванне амаль немагчыма, таму ў дадзеным выпадку такое дзяленне ўмоўнае.

Калі мы гаворым пра свабоднае выхаванне, то павінны пагадзіцца з тым, што грунтоўнае навучанне магчыма толькі праз саманавучанне. Таксама і выхаванне: яно магчыма толькі як самавыхаванне. Яшчэ старажытныя філосафы сцвярджалі, што каня можна падвесці да вадапою, але прымусіць яго піць ваду немагчыма. Калі не будуць працаваць механізмы самарэгулявання, чалавек не здолее ўсебакова развівацца, у тым ліку і сацыяльна.

Калі зыходзіць з прыярытэту самаразвіцця асобы, тады карэнным чынам мяняюцца функцыі як настаўніка, так і выхавацеля. Іх задачы бачацца ў стварэнні адпаведных умоў саманавучання і самавыхавання творчай асобы. Толькі праз асабістую прак-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыку пад кіраўніцтвам педагога вучні набываюць тое, што становіцца іх здабыткам, іх светапоглядам.

Ва ўмовах выхавання без насілля сацыякультурная дзейнасць становіцца адным з найбольш дзейсных метадаў работы не толькі з дзецьмі, але і з моладдзю, дарослымі. Трэба пагадзіцца з вядомым пецярбургскім вучоным М.А.Арыярскім, што сацыяльна-культурная дзейнасць – абумоўленая маральнымі матывамі грамадска мэтазгодная дзейнасць па асваенні, стварэнні, захоўванні, распаўсюджванні і далейшым развіцці каштоўнасцей культуры. Звернем увагу на тое, што СКД як педагагічны феномен абавязкова павінна падпарадкоўвацца маральным імператывам. Вось чаму сацыякультурную дзейнасць нельга абмежаваць ні ўзростам яе ўдзельнікаў, ні месцам ці часам правядзення. Яна можа праходзіць як з дзецьмі дашкольнага ўзросту, са школьнікамі, так і з моладдзю, сталымі людзьмі ці пенсіянерамі, як на школьным уроку ў школе, так і ў пазакласны час, як у закрытым памяшканні, так і на адкрытым паветры. Дарэчы, добры сучасны ўрок (фізікі, матэматыкі, гісторыі ці літаратуры) – гэта ўрок з элементамі СКД.

Вылучым дэтэрмінанты педагагічнай эфектыўнасці сацыякультурнай дзейнасці. Менавіта яны даюць падставу сцвярджаць, што СКД – найбольш эфектыўны метад, а таксама форма педагагічнай работы з рознымі людзьмі.

– Кампетэнтнасць, педагагічныя і арганізатарскія здольнасці кіраўніка СКД.

– Этычная накіраванасць сацыякультурнай дзейнасці.

– Відовішчнасць, своеасаблівы магнетызм, прыцягальнасць.

– Эмацыянальнасць кожнай сустрэчы, вобразнасць падачы матэрыялу.

– Гульнявая аснова пазнання сацыякультурнай рэчаіснасці.

– Здольнасць працяглы час утрымліваць увагу ўдзельнікаў.

– Змена відаў дзейнасці, што змяншае стомленасць.

– Права на памылку.

– Дыскусійны характар мерапрыемстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– Свабода выказвання асабістай думкі (самавыяўленне, праяўленне творчай ініцыятывы).

– Свабода ўваходу і выхаду з творчай гульні.

– Выкарыстанне тэхнічных сродкаў для дасягнення мэты.

– Разнастайнасць формаў і метадаў работы.

– Інтэрактыўны характар зносін.

Такім чынам, аналіз якасцей СКД дазваляе сцвярджаць, што:

– сацыяльна-культурная дзейнасць уключае літаральна ўсе віды дзейнасці чалавека (дзейнасці ў шырокім сэнсе, улічваючы маторыку і інтэлект чалавека);

– сацыяльна-культурная дзейнасць – гэта не толькі працэс, але і вынік дзейнасці чалавека, праз сацыякультурную дзейнасць адбываецца сувязь пакаленняў, захоўваюцца каштоўнасныя традыцыі продкаў;

– сродкамі СКД рэалізуецца сатворчасць суб'ектаў педагагічнага працэсу;

– сацыяльна-культурная дзейнасць – гэта метад, форма і спосаб педагагічнага ўплыву на асобу, своеасаблівы від сацыяльнай кагнітыўнай актыўнасці;

– праз СКД выконваецца крэатыўна-дзейнасны падыход у навучанні і выхаванні;

– універсальнасць метаду СКД: метад можна прымяніць практычна да ўсіх катэгорый кліентаў (дзеці, падлеткі, моладзь, дарослыя, састарэлыя, інваліды і інш.);

– праз гульню чалавек праяўляе сваю сутнасць, у ёй ён, паміма сваёй волі, пазбаўляецца маскі;

– СКД – адзін з найбольш важных аб'ектаў дзяржаўнай бяспекі;

– СКД, і гульня ў прыватнасці, мае катарсічную функцыю. Чалавек праз гульню вызваляе замкнёныя эмоцыі і пазбаўляецца цяжару мінулых фрустрацый.

Элементы СКД мы знаходзім у методыцы педагогаў-наватараў сярэдзіны 80-х гадоў мінулага стагоддзя, распаўсюджваецца яна і ў сучаснай школьнай педагогіцы. Мы

ўпэўненыя, што прафесійнае карыстанне методыкамі СКД дазволіць палепшыць сацыяльны статус школьнікаў не толькі на ўроках літаратуры ці сусветнай мастацкай культуры, але і на занятках па фізіцы, хіміі, матэматыцы. Зараз у вышэйшых педагагічных установах пры падрыхтоўцы настаўнікаў школ, выхавацеляў пазашкольных устаноў звяртаюцца да СКД – універсальнага асобасна арыентаванага педагагічнага метаду.

Заслугай вучоных Беларускага універсітэта культуры з'явілася тое, што ўжо ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя ім удалося ўпершыню на постсавецкай прасторы звярнуць увагу на універсальнасць і педагагічную сутнасць феномена сацыякультурнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Н.И.Олифирович,** *доцент*
**О.В.Агейко,** *преподаватель*

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ АРТТЕРАПЕВТИЧЕСКИХ ТЕХНИК ПРИ ЛЕЧЕНИИ СОМАТИЧЕСКИХ ЗАБОЛЕВАНИЙ

Как известно, при коррекции тех или иных отклонений необходима работа с причинами, их вызывающими. Это позволяет избежать воспроизведения симптоматики неблагополучного развития. Сказанное особенно значимо для работы с детьми и взрослыми, имеющими психосоматические расстройства – начальные этапы тех или иных болезней. А процент таких людей, по данным медицинской статистики, стабильно высок.

Любая болезнь сама по себе является психотравмирующим фактором. Следовательно, в комплексном лечении психосоматических заболеваний немаловажную роль играет психотерапия и, в частности, арттерапия. Особенно эффективно сочетание изобразительного творчества с вербальным.

Так, известные психотерапевты Р.Гудман, М.Либман, А.Мишара отмечают положительное влияние арттерапии не только на